снарядов и батальонных мин – 1087, противопехотных мин – 10, сдано в РВК снарядов 37-мм – 18 ящиков и 1 автомат» [2, л. 1]. Эти цифры – яркий показатель уровня подготовки курсантов и помощи местного населения в ликвидации боеприпасов. В документе отмечается: «Итого взорвано различных снарядов и минометных мин – 4108, авиабомб – 2, противопехотных мин – 12, сдано в РВК г. Щучин 18 ящиков 37-мм снарядов и 1 автомат. Знаки оповещения об отсутствии мин размещены согласно картам района» [2, л. 1]. На основании этих данных можно сделать вывод, что процесс разминирования района был полностью завершён, каких-либо документов о дальнейшей работе по разминированию не обнаружено.

Таким образом, согласно архивным данным, разминирование современного Щучинского района Гродненской области проходило в 2 этапа: 1) июль–октябрь 1944 г.; 2) ноябрь 1944–ноябрь 1946 гг. В результате сапёрами было ликвидировано, по имеющимся данным, более 7000 различных боеприпасов, очищено более 100000 м$^2$ территории. Это позволило не только в кратчайшие сроки обеспечить безопасность граждан, но и перейти к восстановлению народного хозяйства и ликвидации последствий оккупации.

Литература

1. Государственный архив Гродненской области. – Ф. 1171. – Оп. 1. – Д. 24.
2. Государственный архив общественных объединений Гродненской области (ГАООГО). – Ф. 10. – Оп. 1. – Д. 9.
3. ГАООГО. – Ф. 10. – Оп. 1. – Д. 14.
4. ГАООГО. – Ф. 10. – Оп. 1. – Д. 3.
5. ГАООГО. – Ф. 10. – Оп. 1. – Д. 33.

УДК 811.161.3

# ПАРТРЭТ ПАЛЕШУКА Ў ТВОРАХ ІВАНА ПЯТРОВІЧА ШАМЯКІНА

**К. М. Матусевіч**

*Установа адукацыі «Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна», Рэспубліка Беларусь*

*Дзякуючы творам беларускіх аўтараў нам становіцца зразумела асаблівасць рэгіёну, адкуль яны родам. Менавіта любоў да роднага краю іх натхняла пісаць раманы, а нас натхняе знаёміцца з гэтым краем. Аналізуючы творы Івана Шамякіна, неабходна падкрэсліць наколькі яны розныя – напісаныя падчас і пасля вайны, і тыя, што напісаны амаль што ў наш час. Тады было больш сапраўднага, цяжкага, але непадменнага. У наш час шмат чаго ёсць, але дзе дзеўся сорам быць шчаслівым?!*

**Ключавыя словы:** багаты сусвет, семантыка, Палессе, палешукі, бяседа з прыродай.

# THE PORTRAIT OF A PERSON FROM POLESYE REGION IN THE POEMS OF IVAN SHAMYAKIN

**K. M. Matusevich**

*Mozyr State Pedagogic University named after I. Shamyakin, the Republic of Belarus*

*Thanks to the poems of the Belarus authors we can understand the specific of the region, their motherland. Their love to the Motherland was the reason to write about it. And this is the reason for us to learn about their motherland. Analyzing Ivan Shamyakin's poems we can see how*

*different they are – written during the Great Patriotic War, after it, and 20 years ago. Later the relations between people were more honest. Nowadays we have different moments to be written, but where the shame to be happy.*

**Keywords:** wide outlook, Polesye, the people from Polesye, the communication with the nature.

Нацыянальна-культурная інфармацыя выяўляецца пераважна ў намінатыўных адзінках мовы, семантыка якіх адлюстроўвае прадметы, з'явы, якасці, працэсы рэчаіснасці. Такімі адзінкамі, кія маюць цікавасць не толькі як сродак стасункаў, але і як крыніца шматлікіх істотных ведаў пра нацыянальную гісторыю і культуру, ёсць безэквівалентная лексіка, праз якую адлюстроўваецца ўнікальнасць нацыянальна-культурнай семантыкі, захоўваецца, перадаецца ад пакалення пакаленню «моўная карціна свету» народа. У намінатыўных адзінках з нацыянальна-культурным складальнікам увасоблены непаўторны мікракосмас тых рэалій і паняццяў, што вызначаюць адмысловасць пэўнага этнасу. Творы класікаў уплываюць на светапогляд.

Чытаючы творы Шамякіна, спыніцца складана – яго сусвет вельмі багаты, яго прырода казачная, яна мае свой настрой і нават думкі. Менавіта радкі яго твораў найлепш усяго могуць быць выкарыстаны ў якасці напаўнення турыстычных праспектаў і брашур.

«Восеньскімі раніцамі хвойнік напаўняўся вясёлым гоманам і галёканнем дзяцей. …А яшчэ ў хвойніку зграблялі ігліцу, якую клалі на подсціл, каб больш было гною, і накрывалі капцы бульбы». Самому чалавеку зараз убачыць гэтую прыгажосць немагчыма. Мы жывем у складаны час – паспець жыць, шмат чаго ёсць, дзеля чаго мы не заўважаем галоўнай прыгажосці, мы не чуем і не бачым яе. Толькі падглядзеўшы ў класікаў мы можам нешта скласці самі: ***Чуць галасы хвойніку сярод лесу*** [5, с. 4].

Тэксты твораў і іх аналіз прыведзены у табліцы.

| **Тэкст з твора** | **Аналіз думкі і матэрыял для тур. праспекту** |
|---|---|
| Сіратліва стаялі адзінокія хвоі – альбо вельмі тонкія, альбо нізкарослыя і сукаватыя, якія не былі прыгодны для будоўлі, а на дрова – іх цяжка калоць. У Максіма сціснула сэрца ад жалю і крыўды. | *Сэрца, якое баліць па адзінокім хвоям* |
| Узыходзіла сонца. Па небе плылі маленькія пазалочаныя хмаркі, і можна было падумаць, што іх гналі першыя сонечныя праменні, бо ветру на зямлі не было. Панавала цішыня. Васіль усёй сваёй істотай адчуваў нястрымную сілу жыцця, ён бачыў і чуў, як прагна цягнецца ўсё да святла, да сонца, як нараджаецца новае жыццё. | *Бачыць, як нараджаецца жыццё!* |
| Таццяна паглядзела ў той бок і цяжка ўздыхнула. Ёй зрабілася раптам сорамна за сваё дзіцячае захапленне, за сваю кароткую радасць. Балюча сціснула сэрца. Няма чаму радавацца! Яна паставіла вёдры на снег і яшчэ раз аглянулася. Родная зямля! Прыгожая, чароўная! Па ёй хадзілі савецкія людзі, па-рознаму заўважалі і цанілі яе прыгоства, адны спявалі песні аб ёй, пісалі вершы, простыя і шчырыя; другія шукалі ў ёй карысныя выкапні, бралі ў лабараторыі, рабілі доследы… Але ўсе любілі яе, бо гэта была зямля бацькоў, зямля-маці, яна карміла і паіла сваіх дзяцей. А цяпер? Чужынцы топчуць яе, аплёўваюць, паганяць. А у гэтай зямлі ляжыць яе маці… | *Сорам за хвіліну шчасця.* |

*Окончание*

| Тэкст з твора | Аналіз думкі і матэрыял для тур. праспекту |
|---|---|
| – Пакінь ты карову! – махнуў рукою Крап. – Не да каровы цяпер.<br>– Ну не! Карову я ім не пакіну. Скулы ім! Ды і Віцю нельга без малака, і Люба шпарка пайшла назад. Яны чакалі яе каля пуні. Яна вярнулася праз некалькі хвілін, ведучы за сабою карову. | *Подзвіг – не пакінуць карову* |
| Над лесам, ледзь не кранаючы дрэў, ляцелі цяжкія хмары, пагражаючы абваліцца на змораных людзей халодным дажджом. Людзі былі не толькі змораныя, але і галодныя. Праходзячы пад дубамі, многія нахіляліся, сабіралі жалуды і елі іх. Калона расцягвалася. | *Сабіраць жалуды каб з'есці нешта* |
| Вельмі хацелася прытуліць яго да грудзей, прылашчыць, прыгрэць. А потым сядзець вось так усю ноч, глядзець на гэтыя дзівосныя чырвоныя агні навокал, слухаць трывожны стогн пакалечаных сосен, усхваляваныя ўдары яго і свайго сэрца і маўчаць забыўшыся на ўсе пакуты і жахі. Але яна стрымала гэтае парыванне, падумаўшы: «Не! Што гэта я!... Калі побач ляжаць забітыя сябры…» [2, с. 210]. | *Не прытуліць каханага, калі побач ляжаць забітыя сябры* |
| Яны шлі моўчкі па ледзь прыкметнай у гушчары арэшніку сцежцы. Мікалай з радасцю пазнаваў мясціны, праз якія яны праходзілі. З кожнай з іх былі звязаны цікавыя і шчаслівыя ўспаміны дзяцінства. Асабліва добра ён памятаў гэты стары лес: магутныя хвоі, дубы і бярозы, а пад імі – густы арэшнік. Месца тут няроўнае – то высокая гара, то глыбокая нізіна, і славілася яно арэхамі, грыбамі і ягадамі. У ранішнім змроку на соснах бялелі раны старой падсочкі. Яму чамусць па-дзіцячы стала шкада гэтых старых параненых сосен. | *Шкадаваць параненыя сосны* |

Іван Шамякін пачаў пісаць раман «У добры час» на прыканцы 40-х гг. 20 ст. – у той перыяд грамадскага развіцця, калі патрабавалася сапраўдная рашучасць у пераасэнсаванні некаторых заканамернасцяў жыцця, яго перспектыў. Усё, што перажыла краіна пасля вайны стала зместам твора, аўтар якога пільна ўглядаўся ў рух хуткаплыннага часу [5, с. 374–375].

Само жыццё патрабавала ад літаратуры з усёй сілай мастацкай праўды расказаць пра савецкага чалавека, які выйшаў на працоўны фронт і змагаўся з такой жа энергіяй і верай у сацыялістычныя ідэалы, як і нядаўна на франтах Вялікай Айчыннай вайны. Былыя салдаты вярталіся да хаты, і літаратура з усёй уласцівай ёй сілай унутранай чуйнасці не магла не адрэагаваць на сацыяльныя і псіхалагічныя змены жыцця народа ў цяжкі пасляваенны час:

«– *Выходзіць, я – скакун, як ты кажаш, што не пранік у Біблейскія глыбіні. Чытаць легенды, тым больш даўнія, цікава. Але легенды ёсць легенды.*

***– Любое жыццё… асобнага чалавека – легенда***». Часам нельга нешта дабавіць.

«***Мы ж дома. А дома і салома я дома***». Лепш за Шамякіна і ўявіць складана.

Людзі п'янелі ад запаху прэлага лісця: «**У дубняку густы пах прэлага лісця і жалудоў ап'яняў змораных, галодных людзей**» [2, с. 212].

*Пра вайну людзі тады разважалі так:* «***У тую хвіліну не існавала яго ўласнага жыцця з шматлікімі пачуццямі і інстынктам самааховы. Усю яго істоту ахапіла пачуццё: спыніць гэтае чорнае страшыдла***» [2, с. 235].

«***Ён пазнаў месца сваёй хаты па двух абгарэлых бярозавых пнях ды па трох вішнях, што сіратліва стаялі ў канцы былога саду, сярод узаранай, скалечанай***

***зямлі. Пяшчотнае і радаснае пачуццё кранула сэрца старога, калі ён убачыў гэтыя вішні.*** *Карп павярнуўся да дачкі, у вачах яго бліснулі слёзы.*

*– Вішні... Нашы вішні, Танюша. Стаяць... Скажы ты, якія жывучыя!*

*Таццяна зразумела яго і з замілаваннем ціха адказала:*

*– Як мы, тата.*

*Машына спынілася.*

*Старшыня моўчкі аглядаўся навокал. Толькі калі ўжо злезлі ўсе, ён уздыхнуў і таксама саскочыў на зямлю.*

***– Н-да-а... Як жа вы тут будзеце жыць? Ніводнай хаткі...***

***– Нічога, сынок, лес у нас пад бокам. Пражывём»***. І не трэба слоў.

У 1960 г. Іван Шамякін піша твор «Непрыгожая»: ***«У асеннім лесе таксама добра думаецца. Але думкі тут маюць іншую форму: яны яркія, кароткія і хутка змяняюць адна адну. Можа, гэта таму, што ўсё навокал гарыць фарбамі згасаючага сонца – цёплымі фарбамі згасаючага сонца – цёплымі фарбамі жыцця і змагання, якія заўсёды ўзбуджаюць. І шмат што перашкаджае спакойнай і павольнай плыні думак»***.

Твор «Дзеці настаўніцы»: «Віка стаяла каля акна. На дварэ кружыла мяцеліца. *У шалёным віхры сняжынак плылі хаты на другім баку вуліцы. Увесь свет кружыўся ў снежнай каламуці. І снег быў не белы – Віка бачыла яго з мноствам вясёлкавых адценняў: чырвоных, зялёных, жоўтых... Плывуць хаты... Незнаёмыя. Фантастычныя. Гойдаюцца. З боку ў бок, зверху ўніз... Дзяўчыне пачало здавацца, што і сама яна некуды плыве. Куды?* ***У целе – дзіўная лёгкасць, быццам яно страціла вагу. І ў галаве лёгка, замест думак пра маці – радкі добрых, прыгожых вершаў»***.

*«І палякі, і яўрэі, і цыганы былі тут свае людзі. Палякі часта радніліся з тутэйшымі; яўрэі мірна курылі на прызбах разам з палешукамі; амаль у кожным сяле знаходзілася хата, якая давала цыганам цяпло і прытулак на ўсю доўгую зіму.* ***Яны былі ўсе, і цыганы, і палякі, і яўрэі, як ручаінкі, што ўліваліся ў вялікую раку, што самі станавіліся той жа ракою...*** *У тых, што за гушчарамі, за балотамі, багата ў чым і сваё асаблівае жыццё і свае характары.* ***За балотамі зямля найбольш паганая, людзі хапаюцца за лес, шукаюць ратунку ў лесе. З ягадамі, арэхамі, грыбамі запасяць на зіму жалуды: цэлымі гарамі ссыпаюць у засекі»*** [6, с. 188].

Алесь Асіпенка, твор «Канец бабінага лета»: «*Дабрэня разумеў і Грушу, нібы яна – гэта ён, закінуты далёка ад родных мясцін, якія раптам пачалі нагадваць пра сябе то ў сне, то на адзіноце. Такое, пэўна, прыходзіць з гадамі.* ***У маладосці чалавек не вельмі шукае той кут, дзе нарадзіўся, дзе правёў сваё басаногае дзяцінства. Калі гаварыць праўду, дык у маладосці кут гэты як бы нават становіцца цесным, надакучлівым, і тады неадольна цягне ў свет. Але праходзяць гады – і неяк непрыкметна для сябе пачынаеш прыгадваць гэты самы, яшчэ нядаўна не мілы кут, як дарагі і блізкі, і ўжо не разумееш, навошта пакідаў яго...»***.

Зроблены партрэт палешука па творам Шамякіна наступны: жыхары Палесся больш уважлівыя да наваколля і асяроддзя, яны прыслухоўваюцца да таго, што адбываецца побач – ведаюць, як гэта спыніцца і паслухаць, заўважыць і пабачыць. *Чуць галасы хвойніку сярод лесу. Сэрца, якое баліць па адзінокім хвоям. Шкада прыроды, якую загубілі немцы. Бачыць, як нараджаецца жыццё! З задавальненнем слухаць чароўную мелодыю салаўінай песні. Прабірацца цераз балота. Ісці па балоту дарогаю партызан. Патануць у аблоках. Глядзець пад ногі, каб убачыць зоркі. Любое жыццё... асобнага чалавека – легенда. Моўнае багацце чалавека. Смела хадзіць праз паліцаяў. Лятаць па бязмежнай прасторы. Мы ж дома. А дома і салома ядома. Казачная маладосць гораду. Сорам за хвіліну шчасця. Подзвіг – не пакінуць карову. Птушыная воля і пачуццё свабоды. Гаспадары-партызаны. Шкадаваць параненыя*

*сосны. Не прытуліць каханага, калі побач ляжаць забітыя сябры. Спаць ідучы. Мокрае адзенне прагінала людзей. Збіраць жалуды каб з'есці нешта. У дубняку густы пах прэлага лісця і жалудоў ап'яняў змораных, галодных людзей. Змора скоўвала цела. Нават цяжка было думаць. У тую хвіліну не існавала яго ўласнага жыцця з шматлікімі пачуццямі і інстынктам самааховы. Усю яго істоту ахапіла пачуццё: спыніць гэтае чорнае страшыдла. Ён пазнаў месца сваёй хаты па двух абгарэлых бярозавых пнях ды па трох вішнях, што сіратліва стаялі ў канцы былога саду, сярод узаранай, скалечанай зямлі. Пяшчотнае і радаснае пачуццё кранула сэрца старога, калі ён убачыў гэтыя вішні. Лес у нас пад бокам. Пражывём. У асеннім лесе таксама добра думаецца. Але думкі тут маюць іншую форму: яны яркія, кароткія і хутка змяняюць адна адну. Можа, гэта таму, што ўсё навокал гарыць фарбамі згасаючага сонца – цёплымі фарбамі згасаючага сонца – цёплымі фарбамі жыцця і змагання, якія заўсёды ўзбуджаюць. І шмат што перашкаджае спакойнай і павольнай плыні думак. Зоркай іншага сусвету бліскаў кляновы ліст, што раптам з'явіўся перад вачамі на дарозе. Я заварожана спынiўся перад ім. Адкуль ён зляцеў? Ах, вунь ён дзе, клянок! У полі я думаў пра настаўніцу, якую намерыўся праведаць, і ў маёй галаве складаўся цэлы раман з жыцця гэтай жанчыны. У лесе я забыўся на яе. У целе – дзіўная лёгкасць, быццам яно страціла вагу. І ў галаве лёгка, замест думак пра маці – радкі добрых, прыгожых вершаў. Раней яна толькі бачыла прыгажосць фарбаў у навакольным свеце, умела адрозніць у белым снезе іншыя колеры і адценні. Але ніколі не чула, каб снег і ўсё наваколле пачало гучаць такой вось незвычайнай музыкай. Яны былі ўсе, і цыганы, і палякі, і яўрэі, як ручаінкі, што ўліваліся ў вялікую раку, што самі станавіліся той жа ракою... За балотамі зямля найбольш паганая, людзі хапаюцца за лес, шукаюць ратунку ў лесе. З ягадамі, арэхамі, грыбамі запасяць на зіму жалуды: цэлымі гарамі ссыпаюць у засекі.*

Прыгожа, шчыра, па-сапраўднаму жылі і марылі, малі надзеі на будучыню.

Літаратура

1. Шамякін, І. П. Збор твораў Раман «Зеніт» / І. П. Шамякін. – Мінск : Мастац. літ., 2014. – Т. 18. – 575 с.
2. Шамякін, І. П. Збор твораў / І. П. Шамякін. – Мінск : Мастац. літ., 2012. – 413 с.
3. Шамякін, І. П. Збор твораў. Аповесці 1994–1996 / І. П. Шамякін. – Мінск : Мастац. літ., 2011. – Т. 6. – 582 с.
4. Шамякін, І. П. Збор твораў. Аповесці 1999–2000 / І. П. Шамякін. – Мінск : Мастац. літ., 2012. – Т. 8. – 655 с.
5. Шамякін, І. П. Збор твораў. У добры час / І. П. Шамякін. – Мінск : Мастац. літ., 2012. – Т. 10. – 477 с.
6. Мележ І. П. Подых навальніцы / І. П. Мележ. – Мінск : Мастац. літ., 2008. – 557 с.

УДК 04(476)"1941/1945"

# ПРЕСТУПНАЯ ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ ЛИТОВСКИХ ФОРМИРОВАНИЙ В ЗАПАДНЫХ ОБЛАСТЯХ БЕЛАРУСИ

**Д. А. Чикирис**

*Учреждение образования «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы», Республика Беларусь*

Научный руководитель Э. С. Ярмусик

*Рассмотрена преступная деятельность литовских коллаборационистских формирований на территории западных областей Беларуси в годы Великой Отечественной войны.*